# УРОКІ ПАЗАКЛАСНАГА ЧЫТАННЯ

***В.В. Круглякова*** *(УА МДПУ імя І.П. Шамякіна)*
Навуковы кіраўнік – В.Я. Барысенка, канд. філал. навук, дацэнт

Урокі пазакласнага чытання – асноўнае звяно ў сістэме педагагічнага кіраўніцтва самастойным чытаннем дзяцей. Яны маюць сваю спецыфіку і адрозніваюцца ад урокаў класнага чытання, бо накіраваны на рашэнне іншых задач. Структура ўрокаў пазакласнага чытання залежыць ад агульных дыдактычных заканамернасцей – тэмы заняткаў і асаблівасцей матэрыялу, які складае змест урока.

Развіццё маўлення вучняў – адна з асноўных задач урокаў пазакласнага чытання. Рашэнне гэтай задачы накіравана на авалоданне вучнямі мовай як сродкам зносін і пазнання рэчаіснасці, формай выражэння мыслення. Важнасць развіцця маўлення тлумачыцца яшчэ і тым, што адначасова з фарміраваннем камунікатыўна-маўленчых уменняў адбываецца інтэлектуальнае развіццё школьнікаў, выхаванне маральна-этычных якасцей асобы.

На ўроках пазакласнага чытання асобная роля ў развіцці маўлення вучняў адводзіцца слоўнікавай рабоце, дыдактычным гульням і пераказам. Слоўнікавая работа на ўроках пазакласнага чытання дапамагае развіццю маўлення і фарміруе арфаграфічныя навыкі. Тлумачацца найбольш цяжкія, аналізіруюцца найбольш яркія, вобразныя звароты, якія вучням трэба запомніць. Для слоўнікавай работы дзеці вучацца выкарыстоўваць даведнікі, спасылкі і зноскі ў нізе старонкі, заўвагі ў канцы кнігі.

Пераказ прачытанага на ўроку пазакласнага чытання адрозніваецца ад пераказу на ўроках чытання. Вучні перадаюць сюжэт кнігі (сціслы пераказ), пераказваюць тое, што спадабалася (выбарачны пераказ), перадаюць прачытанае па ролях, інсцэніруюць асобныя эпізоды. На ўроках пазакласнага чытання ствараюцца ўмовы для творчых відаў работы: ілюстраванне прачытанага (славеснае і графічнае), аплікацыя, лепка, выкарыстоўваюцца гуказапісы, малюнкі, рэпрадукцыі карцін, партрэты, дыяфільмы. Праводзяцца пісьмовыя творчыя работы тыпу сачынення, водзываў па прачытаным творы, заўвагі па прачытанай кнізе.

Усе віды заняткаў на ўроках пазакласнага чытання павінны падпарадкоўвацца адной з важнейшых задач – выхаванню чытацкай самастойнасці вучняў. У сувязі з гэтым настаўнік, рыхтуючыся да ўрока пазакласнага чытання, прадумвае формы самастойнай работы і прыёмы падключэння да яе ўсіх вучняў.

Такім чынам, практычна ўсе віды работы на ўроках пазакласнага чытання садзейнічаюць развіццю мовы малодшых школьнікаў. Асаблівае значэнне надаецца слоўнікавай рабоце, пераказам, выкарыстанню займальнага матэрыялу і інш.



МГПУ им. И.П. Шамякина